І першае іх грунтоўнае вывучэнне пададзена ў шэрагу работ, у тым ліку і вучэбным дапаможніку І. Я. Лепешава [3].

На аснове адзначанага і з улікам увагі моваведаў да лінгвістычных прыкмет парэмій сёння яны выдзелены ў асобную групу адзінак маўлення, якія характарызуюцца ўстойлівасцю, узнаўляльнасцю, закончанасцю выказвання, якое поўнасцю або часткова алегарычнае, як правіла, павучальнага зместу і абагульняльнага характару ў выглядзе простага ці складанага сказа. Адзначанае вышэй неаспрэчна сведчыць, што дзякуючы ідэнтыфікацыі парэмійных адзінак сёння выдзелена самастойная дысцыпліна парэміялогія – навука аб парэміях, якая мае свой аб'ект, задачы і выпрацоўвае метады даследавання.

**Літаратура**

1 Фядосік, А. С. Прыказкі прымаўкі: у дзвюх кнігах. Кніга 1 / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 616 с.

2 Янкоўскі, Ф. М. Беларуская фразеалогія / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск : Народная асвета, 1981. – 78 с.

3 Лепешаў, І. Я. Парэміялогія як асобны раздзел мовазнаўства: дапам. / І. Я. Лепешаў. – Гродна : ГрДУ, 2006. – 279 с.

**УДК 392.1(476.2 -37)**

***А. М. Рэшанок***

## МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА

*У артыкуле на аснове аўтэнтычнага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу характарызуюцца радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі, звесткі пра якія былі запісаны на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Увага засяроджана на асобных структурных кампанентах радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу, які ўключае libародавы і родавы перыяды. Характарызуючы асобныя абрады і звязаныя з імі рытуалы, аўтар прыводзіць цікавыя прыклады прыкмет і павер'яў.*

Сям'я, у якой нараджаліся дзеці, з даўніх часоў была галоўным прыярытэтам у жыцці беларусаў. Невыпадкова нашы продкі надавалі вялікае значэнне выкананню радзінна-хрэсьбінных абрадаў і звычаяў. У структуры радзінна-хрэсьбіннай абраднасці вылучаюцца такія кампаненты, як прыкметы і павер'і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, выбар кума і кумы, падрыхтоўка бабкай-павітухай абрадавай стравы – кашы, абрад хрышчэння дзіцяці, хрэсьбіннае застолле, абрад разбівання гаршка з кашай, дзяльба кашы, рытуалы ўшанавання бабкі-павітухі, адорванне падарункамі кумоў, бабкі і жанчыны-парадзіхі. Адзначым, што ў кожным раёне Гомельскай вобласці падчас палявых экспедыцый былі зафіксаваны адметныя асаблівасці абрадаў і звычаяў, звязаных з нараджэннем дзіцяці. Прапанаванае даследаванне грунтуецца на архіўных матэрыялах навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі ГДУ імя Ф. Скарыны, а таксама на ўласных запісах, зробленых у 2016 годзе ў час фальклорнай экспедыцыі на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна. Засяродзім увагу на мясцовай спецыфіцы асобных структурных элементаў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, сярод якіх можна вылучыць прыкметы і павер'і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны. Жыткавічане верылі, што ад яе паводзін, выканання ёю пэўных народных рэгламентацый і правіл залежаць здароўе, шчасце і дабрабыт нованароджанага: "Як бярэменная, то калі спужаесса, то не трэба хватацца за цело,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бо дзіця будзе покрытэ пятнамі. Нельзя лезці ў жэрдзіны. Нельзя, як сціраеш, класці одзежу выкручаную на плечы, штоб пупавіна не завезаласа на шыі дзіцяці. Нельзя на кладбішчы ходзіць, бо можэ зробіцца плохо, дзіця можэ родзіцца з жоўтою кожэю, бу ў мертвеца. Нельзя гледзець у вокно, як везуць покойніка" (в. Пухавічы) [1, с. 227]. Паводле сведчанняў Кацярыны Мікалаеўны Макарэвіч, 1954 г. н., в. Бялёў, "ну, када зацяжарыла жэншчына, … кошку нагой яна нікагда не магла ўдаріць, патаму што эта сільна быў вялікі грэх. Яшчэ было эта такое самае, што еслі ўбачыш – гарыць агонь, яна замеціла, не нада хватацца за часткі цела, эт самае, ілі за ліцо бывае, ілі за што-небудзь хватацца, еслі ана сваціласся, іспуду палучаецца, там, эт самае, палучаецца пятно, такое краснае, наліўное крывёй пятно. Но яно ў некаторых праходзіць, у некаторых застаецца пажызненна". Паводле народных вераванняў жыхароў в. Азяраны, цяжарнай жанчыне забараняліся пэўныя віды работы ў святочныя дні: "Ну еслі она беременная празнікі, якія празнікі ці малыя, ці большыя, ей не нада ні рэзаць, ні шыць, ні в'язаць – нічэго этого делаць, і дажэ поднімаць не нада, ёй не давалі ўжэ, абычна што тогда мяшкі. Она должна сохраніць рэбёнка, не давалі делаць нічога, она так" (запісана ад Аліфіровец Ніны Васільеўны, 1937 г. н.).

Даўней нараджалі дзіця дома або ў якім-небудзь гаспадарчым памяшканні, аб чым сведчаць фактычныя матэрыялы: "Роды адбываліся ў хаце ці нейкай гаспадарчай пабудове. Цяжарная жанчына павінна была абысці вакол таго месца, дзе будзе ражаць, чытаючы пры гэтым малітву" (в. Рычоў) [1, с. 225]. "Ну рожала она дома, тогда ж не было акушэраў. Я сама радзіла ўсе троя дома" (запісана ў в. Азяраны Жыткавіцкага р-на ад Аліфіровец Ніны Васільеўны, 1937 г. н.). "Некаторыя жыткавічане распавядаюць аб абавязковым прыняцці родаў дома: "Калі ражала жэншчына, то звалі бабку-повітуху і роды прынімалі дома" (в. Пухавічы) [1, с. 228]. Як вынікае з прыведзеных запісаў, важную ролю ў працэсе родаў жанчыны-парадзіхі выконвала бабка-павітуха. Паводле сведчанняў інфармантаў в. Азяраны,"павітуха дапамагала парадзісе як магла. Акрамя чыста акушэрскіх прыёмаў, яна выконвала шэраг магічных дзеянняў, заснаваных на веры ў звышнатуральныя сілы. На парадзісе расшпілялі ўсе гузікі, развязвалі вузлы, паясы, расплятали косы, адкрывалі ўсе замкі, дзверы, куфры ў хаце. Бабка шаптала замовы, пастуквала венікам у столь, як бы звяртаючыся за дапамогай да дамавіка. Вадзіла парадзіху тры разы вакол стала і праз ганак, якія лічыліся свяшчэннымі месцамі хаты. Дзейсным сродкам аблягчэння пакут парадзіхі лічыўся такі: зняць у дзяжы абруч і надзець яго тры разы на парадзіху зверху ўніз. Павітуха ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а накрывала іх якім-небудзь старым адзеннем, каб у будучым дзіця жыло ў багацці. Часам жартам павітуха загортвала хлопчыка ў жаночую сарочку, каб яго, як падрасце, любілі дзяўчаты" (в. Азяраны) [1, с. 221]. У некаторых вёсках раёна падчас нараджэння дзіцяці павінен быў прысутнічаць і муж: "У час родаў павінны былі прысутнічаць муж і баба-павітуха" (в. Рычоў ) [1, с. 225].

Як адзначылі жыхары з в. Пухавічы, бабка-павітуха выконвала найважнейшую функцыю пры купанні нованароджанага: "Повітуха сама отрэзала пуповіну і завязвала яе. На другі дзень баба-повітуха прыходзіла муць дзіцятко, ужэ наварыць горшчык компоту да прынясе ўнуццы. Обмуваць обезацельно трэба було, потому што это шчытаецца, як бу ты его вубросіла на двор, но Бог его пудыме, і ён его сам обмуе. А сомой обмуваць нельзя. А еслі ты не обмула его, то это, шчытай, як ты яго вубросіла на поле. Калі жэншчына рожала, то трэба було, штоб людзей менш знало, штоб рожалоса легчэ" (в. Пухавічы) [1, с. 228]. Паводле ўласных запісаў, зробленых у в. Бялёў, "баба-павітуха ўсегда купала першы раз дзіця, калі жанчыну прывозілі, эт самае, із бальніцы, але раней ражалі, эт самае, дома, значыць, першую, што звалі, эта бабу-павітуху, каторая, эт самае, яна бывала мо прымала і роды, еслі самае што бывае трудные, яна астаецца і за бабу-павітуху, і яна купае дзіця, і тады ўжо самае её ўсё" (запісана ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г. н.). У в. Азяраны, як засведчылі мясцовыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыхары, бабка-павітуха не толькі перавязвала пупавіну цяжарнай жанчыне, але і рыхтавала для яе пэўныя віды страў для адведак: "Бабу зовуць, бабу-повітуху. Вот такія бабы і ўжэ старыя оні ўжэ эту пуповіну ту зав'яжуць, уберуць усе. Эта ужэ бабка шчыталас новорождённого, ето яе ўнукі. Бабку выбіраюць по нраві кажды. От не так што от узяў ды, а хто нравіцца, ці родственіца яка. Прыбягаюць ужо ж, молодая як думае рожаць, дак прыходзяць: "Ходзіце к нам на роды". Ужэ бабка бярэ пялёнкі две ці што там і прыходзіць. А ўжэ на трэйцій дзень бабка готовіць, эта сама котора ўбрала ўсё, кашу варыць, пампухі пячэ, мочае, яйца, што мае, варэнне ў кошэль, тоды ж, карзіны цяпер, тоды кошэлі большыя булі" (запісана ў в. Азяраны Жыткавіцкага р-на ад Аліфіровец Ніны Васільеўны, 1937 г. н.).

Пасля нараджэння дзіцяці ў адведкі ("вотведкі") маглі прыходзіць разам з бабкайпавітухай таксама родныя і сябры бацькоў: "Калі дзіця нарадзілася сённі, значыць яе прывезлі із бальніцы (раньше дома ражаліс), значыць тады ўвечары прыходзілі ў вотведкі, называліс такіе" (запісана ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г. н.).

Важны момант радзінна-хрэсьбіннай абраднасці – выбар кума і кумы. Зыходзячы з уласных запісаў, зробленых у в. Бялёў, "хросных выбіралі хто як: хто радню выбіраў, хто можа ідзе да таго, хто яму дапамог у трудную мінуту, палучалась так, эт самае" (запісана ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г. н.).

Жыхары Жыткаўшчыны лічылі абавязковым правесці абрад хрышчэння нованароджанага, які не абыходзіўся без прысутнасці кума і кумы, а таксама бабкі-павітухі. Аднак у некаторых вёсках забаранялася знаходзіцца ў царкве бацькам дзіцяці: "Важным было хрышчэнне – абарона дзіцяці ад нячыстай сілы. Звычайна кума выбірала кума. Таксама на хрысціны дзіцяці выбіралі хросную бабу. Абрад хрышчэння дзіцяці адбываўся ў цэркві. На хрышчэнне дзіцяці ехалі кум і кума. Маці і бацьку ехаць забаранялася" (в. Рычоў) [1, с. 225]. "Ужэ хрэсьбіны роб'яць мо чэрэз месяц ці там. Ужэ ззываюць родню, кума ета і кума ўжэ говораць ім. І кума готовіцца, усе подаркі бярэ. Баба собе і от хрэсьбіны ідуць" (запісана ў в. Азяраны Жыткавіцкага р-на ад Аліфіровец Ніны Васільеўны, 1937 г. н.).

Самае важнае месца ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Жыткавіцкага раёна адводзіцца рытуалу разбівання гаршка: "Самым галоўным у гэтым застоллі была бабіна каша. Перад тым, як разбіць горшчык з бабінай кашай, яе патрэбна было выкупіць. Выбіралі сярод прысутных самага гаварлівага і жартаўлівага чалавека, які быў лічыльнікам (лічыў, на якую суму пакладзе на горшчык з кашай кум, кума, баба). Клалі на горшчык не ўсё сразу, а паступова, а лічыльнік лічыў. Заўжды рабілі на канцы так, каб каша была кумава. І ён разбіваў гаршок з бабінай кашай" (в. Дзякавічы) [1, с. 222]. У в. Азяраны, паводле сведчанняў жыхароў, разбіваў гаршчок з кашай той з гасцей, хто пакладзе больш грошай. Звычайна гэту ролю выконваў кум: "Кум кладзе грошы, пошчыталі – ужэ "кумава каша", бо кум больш положыў, кума кладзе – пошчыталі ўсяго, што яна там кладзе. Яна кладзе і покрывала можэ, і мужыку рубашку, і этому дзіцятку і обуві, і одзежу, і курткі – усё, што есць. Шчытаюць усе, тамада шчытае, што стоіць і сколькі ўсяго это будзе, і от ужэ "куміна каша", – говорыць. Кум зноў кладзе грошы, ужэ кум поклаў грошы – "кумава каша". Тут баба ўмае з-за пазухі шчэ чаго-то, кладзе – ужэ "бабіна каша", а куму ж стыдно, шо не поб'е кашу, да баба, кум зноў кладзе і так могуць цэлы час он і класці ўсе і шчытаць, хто сколькі больш положыць. Ну і обычно наверно кум б'е кашу, того кума выцадзяць, о!" (запісана ад Аліфіровец Ніны Васільеўны, 1937 г. н.). У гэтай вёсцы было прынята чарапкі ад гаршка з кашай класці на галаву незамужняй дзяўчыны: "Ну ўжэ кум побіў кашу, ужэ на столы кашу ўсім на тарэлочкі поклалі, надо ж покоштоваць: ці яка яна, ці смачная ці. Ужэ о выпілі на кашу і расходзяцца ўжэ. А чэрэпкі этыя остаюцца, ну бяруць этыя чэрэпкі хто незамужні кладуць на голову, або эты горшчок, што остоецца рыльцо, радом хто

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сядзіць молоды, то на голову поклодут, штоб быстро замуж ішоў, шоб богаты быў" (запісана ад Аліфіровец Ніны Васільеўны, 1937 г. н.).

У структуры радзінна-хрэсьбінай абраднасці Жыткавіцкага раёна меў месца і звычай "адвозіць" бабку-павітуху ў магазін: "А бабу, самае, ужэ пабілі кашу, бабу садзілі ў якую каляску, а то ў балею і ўжэ цягнулі яе до магазіна, эт самае, к магазіну, каб баба што-нібудзь там купіла. Яе вязуць па вуліцы, самае, співаюць, мужыкі цягнуць, а бабы ссадзі, і бабы бягуць за імі, цягнуць эту бабу до магазіна ў каляске-то легчэ, на санках, але ўжо як у балеі цягнуць! Але цягнуць, заязджаюць у магазін, танцуюць перад бабай, купляе там ўжэ выпіўку" (запісана ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г. н.).

Паводле расповедаў жыхароў, на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна хрэсьбіны праходзілі таксама за вясёлым застоллем: "Выпівалі першую чарку за бацькоў дзіцяці і дзіця. За сталом гаварылі, жартавалі, прыказвалі" (в. Дзякавічы) [1, с. 222]. "Усе госці гулялі, елі і спявалі" (в. Рычоў) [1, с. 225].

Прыведзеныя матэрыялы па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Жыткавіцкага раёна паказваюць усю важнасць вышэйназванага комплексу для жыткавічан. Даследуючы іх традыцыі і звычаі, можна з упэўненасцю сказаць, што яны жадаюць мець здаровых, прыгожых і разумных дзяцей, а таксама жыць у згодзе не толькі з імі, але і з усім светам, праяўляючы толькі лепшыя рысы свайго характару – шчырасць, дабрыню, сумленне.

**Літаратура**

1 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-укладальнікі В. С. Новак, В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыца, А. М. Воінава, С. А. Вяргеенка, А. М. Палуян, А. У. Партнова-Шахоўская. – Гомель : Барк, 2013. – 380 с.

**УДК 94(363.6)**

***М. В. Савенок***

## ВЕСТГОТЫ: ОТ ЛЕГЕНДАРНОГО ПЕРЕСЕЛЕНИЯ ДО ВТОРЖЕНИЯ В РИМ

*Статья посвящена переселению вестготов на территории Западной Римской империи. Рассмотрено с какими процессами было связано перемещение племени вестготов в империю и внутри империи. Выявлены причины захвата Рима. Подведены итоги переселения вестготов на территорию империи.*

Племена германской группы сыграли большую роль в истории Европы. Они оставили своей, до сих пор видимый, след по всем уголкам континента. Они повлияли на развитие и становление множества народов современной Европы и не только. Эта группа включает в себя множество племен, многие из которых навсегда вписали свое имя в истории. К этим племенам относятся тевтоны, свевы, вандалы, франки херуски, кимвры и т. д. Но среди всех них особого внимания заслуживают готы. Такого внимания они заслуживают по ряду причин: 1) о них сохранилось по сравнению с другими племенами относительно большое количество письменных источников 2) это тот редкий случай, когда две ветви одной племенной группы смогли основать свои государства 3) вестготы, одна из готских ветвей, первая, кто смогла оружием взять Рим за последние 800 лет с крайнего такого случая. Поэтому, для того, чтобы понять, как им удалось осуществить 2 и 3 пункты причин и стоит углубиться в историю их происхождения и переселения.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ